Evgeniy Sergeevich Efremenko, Head of the Department of Biochemistry, Omsk State Medical University of the Ministry of Health of Russia, Candidate of Medical Sciences, Associate Professor.

УДК 262

# РАВІН ІСЭР ЕГУДА УНТЭРМАН І ЗНАЧЭННЕ ЯГО ДЗЕЙНАСЦІ ДЛЯ СУЧАСНАГА ІЎДАІЗМУ

*А. У. ЦІХАМІРАЎ*
*Гродзенскі дзяржаўны музей гісторыі рэлігіі, г. Гродна, Беларусь*

XX стагоддзе было вельмі складаным часам для большасці рэлігійных плыняў. Іўдаізм не быў выключэннем. Разгорнутыя і глыбокія тэалагічныя дыскусіі, якія адбіваліся на практычным прымяненні рэлігійных законаў і паўсядзённым жыцці людзей узнікалі на фоне сацыяльных і палітычных пераменаў. Важнейшай падзеяй, якая моцна змяніла погляды іўдзейскага духавенства быў Халакост. Пасля абвяшчэння незалежнасці Дзяржавы Ізраіль у 1948 г. духавенства павінна было вырашаць і шэраг практычных пытанняў, звязаных з функцыянаваннем самастойнай дзяржавы ў сучасным свеце. Улічваючы вялікі ўплыў іўдзейскага рэлігійнага права (Галахі) на юрыдычную сістэму Ізраіля, равінат адыгрывае важную ролю ў сацыяльным жыцці. У другой палове 1940-х – пачатку 1970-х гг. на гэтыя працэсы паўплываў і ўраджэнец Беларусі Ісэр Егуда Унтэрман.

Ён нарадзіўся 19 красавіка 1886 г. у Брэсце ў сям'і равіна і настаўніка Эліяху Унтэрмана і Шэйны, дачкі равіна Эльханана Фішэра. Навучаўся ў ешывах “Анаф эц-Хаім” у Малечы (зараз у Бярозаўскім раёне Брэсцкай вобласці) (пад кіраўніцтвам Шымана Шкопа) [1], Міры, Валожыне. Таксама ёсць звесткі, што ён навучаўся ў гродзенскай ешыве “Шаарэй Тора” (“Вароты Торы”) [2, с. 382].

Пасля шлюбу Унтэрман быў ардынаваны на равіна равінам Рафаэлем Шапіра (1837-1921) і даянам (суддзёй) Брэста Сімха-Зэлігам Рэгуэрам (1864-1942) у Валожыне [1]. У 1910 г. ён заснаваў і пачаў кіраваць ешывай у Вішневе, а потым быў равінам у Магільным (зараз Столінскі раён Брэсцкай вобласці) і Мсцібаве (зараз Ваўкавыскі раён Гродзенскай вобласці). У 1920-1924 гг. – равін горада Гродна (паводле Вольгі Сабалеўскай і Уладзіміра Ганчарова – з 1922 г., у тагачасных дакументах імя запісвалася як Ізер) [3, с. 124; 4, с. 253].

Ужо з пачатку XX ст. Унтэрман быў вядомым прыхільнікам руху мізрахі. Гэты сіяніцкі рэлігійны рух быў заснаваны на ўстаноўчым сходзе 4-5 сакавіка 1902 г. у Вільні. Асноўным прынцыпам, якога прытрымліваліся члены арганізацыі быў заклік “Зямля Ізраіля для народа Ізраіля, згодна з Торай Ізраіля”. Заснавальнікі руху лічылі, што Тора павінна быць духоўнай асновай нацыянальнага адраджэння яўрэйскага народа на яго гістарычнай радзіме[5]. У 1921 г. Унтэрман быў дэлегатам XII Сіяніцкага кангрэса і пазней прымаў удзел у іншых сіяніцкіх кангрэсах[1].

У 1924 г. (па іншых звестах – у 1923 г.) ён быў абраны равінам Ліверпуля, дастаткова хутка авалодаў англійскай мовай і стаў вядомы ў яўрэйскай абшчыне Англіі. Апрача гэтай пасады быў прэзідэнтам Брытанскай нацыянальнай арганізацыі "Мізрахі", віцэ-прэзідэнтам брытанскіх філіялаў Яўрэйскага нацыянальнага фонда і "Керэн-ха-Есод" ("аб'яднаны фонд", фінансавы орган Сусветнай сіяністкай арганізацыі і Яўрэйскага агенцтва, заснаваны ў ліпені 1920 г. у Лондане) [6]. У Ліверпулі ён актыўна працаваў з мясцовай яўрэйскай моладдзю і прыклаў шмат высілкаў для аб'яднання яўрэйскіх арганізацый у адну каардынацыйную структуру. Таксама Унтэрман узмацніў мясцовую ешыву, запрасіў у яе моладзь з Германіі і іншых краін і заснаваў у Ліверпулі талмуд-тору[1].

Падчас Другой сусветнай вайны нават ва ўмовах авіяналётаў Унтэрман адмовіўся пакінуць сваю пасаду і горад, рэгулярна наведваў членаў мясцовай абшчыны, якія пераехалі ў навакольныя мясцовасці, а таксама яўрэяў, якія знаходзіліся ў лагерах для інтэрнаваных асоб. У прадмесці Ліверпуля равін Унтэрман стварыў дом для дзяцей-бежанцаў[1]. У 1946 г. ён выступіў перад Англа-амерыканскім следчым камітэтам па Палестыне, выказваўся за абарону правоў іншаземцаў і быў членам Савета хрысціян і яўрэяў[7].

У 1946 г. Унтэрман быў абраны галоўным ашкеназскім равінам Тэль-Авіва і Яфы. У гэты перыяд ён выступаў за ўзмацненне пазіцыі равінскіх судоў і рэлігійных інстытуцый, быў членам Галоўнага савета равіната[1]. У літаратуры адзначаецца, што менавіта пры ягоным кіраванні равінскія суды пачалі працаваць эфектыўна і вырашаць шматлікія складаныя пытанні[7]. У 1952 г. равін Унтэрман ад імя арганізацыі "Аб'яднаны Яўрэйскі Заклік" (была заснавана яўрэйскімі абшчынамі ЗША ў 1939 г. [8]) знаходзіўся з візітам у ЗША. Гэтая паездка дапамагла ўмацаванню і пашырэнню адносін паміж ізраільскімі і амерыканскімі равінамі[7]. У 1952 г. (паводле іншых звестак ў 1955 г.) была выдадзена яго кніга "Шэвет мі-Іуда" ("Род Іуды") аб праблемах Галахі. Дзякуючы гэтай публікацыі равін Унтэрман быў прызнаны адным з найбольш важных галахічных аўтарытэтаў пасля Другой сусветнай вайны і лічыўся адным з найбольш спагадлівых і паблажлівых "посэкаў" (галахічных суддзяў) [9]. Ён таксама публікаваў у перыядычных выданнях, унёс шмат каштоўных дапаўненняў у зборнік "Оцэр-ха-Поскім" [10].

У 1964-1972 г. Унтэрман быў галоўным ашкеназскім равінам Ізраіля, адначасова з галоўным сефардскім равінам Іцхакам Нісімам (1896-1981). У гэты перыяд ён займаўся рэфармаваннем сістэмы равінскіх судоў і выдаў важныя рэспонсы (галахічныя пастановы). Дакументы, які выдаваў равін Унтэрман у гэты час вельмі часта засноўваліся на падставах, якія ён засвоіў падчас навучання ў ешывах і працы ў Беларусі. Сярод іх былі пастановы наконт прынцыпа "пікуах нефэш" ("ратаванне душы", паводле якога ў сітуацыі пагрозы жыццю канкрэтнага чалавека любыя забароны Торы адмяняюцца), надзейнасці сведчання медыкаў з пункту гледжання галахі, наконт законаў аб шлюбе і разводзе, пытанняў статуса канкрэтнай асобы, трансплантацыі сэрца і працэдуры прыняцця іудаізму [1].

Таксама Унтэрман заснаваў дзве талмудычныя акадэміі (калелі) у Тэль-Авіве (“Шэвет мі-Іўда”, “род Іўды”) і Ерусаліме (“Шевет у-ме-Хокім”), падрыхтаваў студэнтаў, якія павінны былі заняць важныя пазіцыі ў Галоўным равінаце і адукацыйнай сістэме, асабліва звяртаючы іх увагу на сістэматычнае вывучэнне Талмуда і практычную Галаху [7].

Паводле Дова С. Закхэйма, равін Унтэрман прытрымліваўся ўмеранага курсу па пытаннях асабістай рэлігійнасці кожнага чалавека. Гэта было адным з важных фактараў, які ўлічваўся падчас выбараў галоўнага равіна ў 1964 г. У сувязі з першай вялікай хваляй імігрантаў з Савецкага Саюза, многія з якіх былі ў змешаных шлюбах, Унтэрман выступаў за мяккі падыход да справы прыняцця іўдаізму мужам ці жонкай неяўрэйскай нацыянальнасці. “Нягледзячы на тое, што ён цалкам прызнаваў, што шчыры намер навернутага прыняць міцвот (запаведзі) быў неабходнай ўмовай для навяртання, ён тым не менш, сцвярджаў, што нават “калі імігранты не мелі намеру цалкам жыць у адпаведнасці з запаведзямі, ня варта асуджаць такія навяртанні”, каб грамадскасць не прыйшла да высновы, што равіны займаюць непрымірымую пазіцыю ў справах прыняцця іўдаізму” [11]. У 1971 г. равін Унтэрман напісаў, што ізраільскія равіны павінны быць больш паблажлівыя ў гэтым пытанні ў сувязі з абставінамі жыцця ў СССР. Варта заўважыць, што калі ён быў равінам у Ліверпулі, то прытрымліваўся больш строгіх поглядаў[12]. Унтэрман выступаў за паразуменне паміж рэлігійным і свецкім насельніцтвам Ізраіля[1].

У 1973 г. прайшлі перавыбары галоўных равінаў і ўпершыню ў гісторыі Ізраіля абодва равіны страцілі свае пасады. Пры непасрэдным уплыве ўраду прэм’ер-міністра Голды Меір замест Унтэрмана быў выбраны Шлома Горэн (1917-1994), а замест Нісіма – Аваддзя Ёсэф (1920-2013). Гэта было звязана са скандалам вакол “справы Лангераў”, які меў палітычныя і сацыяльныя наступствы. “Справа Лангераў” (ці “справа брата і сястры”) – складаная юрыдычная і рэлігійная сітуацыя, якая атрымала публічны розгалас ў канцы 1960-х – на пачатку 1970-х гг. у Ізраіле і ўзмацніла супярэчнасці паміж living рознымі групамі грамадства. У пачатку 1930-х гг. 14-гадовая тады Ева (Хава) Гінзбург збегла з дому ў польскім горадзе Лукуве і пачала жыць з палякам-каталікам Болекам Боракоўскім (па іншай версіі – Буракоўскім). Нечакана для ўсіх пасля сустрэчы з бацькам Евы, Болек абвесціў, што прайшоў абрад гіюра (прыняцця іўдаізму) і прыняў імя Аўраам. Аўраам і Ева пажаніліся і ў 1933 г. разам з бацькамі пераехалі ў Палесціну. Аднак там сямейнае жыццё не заладзілася і сужэнцы разышліся, пры гэтым не аформілі развод (гет) згодна з галахічным правам. У 1944 г. Ева выйшла замуж за Ота (Еошуа) Лангера паводле ўсіх рэлігійных правілаў, але чаму нягледзячы на адсутнасць разводу гэты шлюб адбыўся не да канца зразумела. У Евы і Ота нарадзіліся сын Ханах і дачка Мір’ям. У 1951 г. Аўраам Боракоўскі вырашыў ажаніцца зноў і звярнуўся з позвам аб разводзе ў равінскі суд Тэль-Авіва. У час разбіральніцтва высветлілася, што Ева не атрымала развод і суд патрабаваў, каб яна развялася з Ота. У 1952 г. Ота памёр. Праз некалькі год Ева зноў вырашыла выйсці замуж і зноў звярнулася ў равінскі суд. У выніку суд пастанавіў, што яе дзеці

ад Ота нарадзіліся раней, чым яна развялася з першым мужам і абвесціў іх мамзерамі (незаконнанароджанымі). Згодна з Галахой такія людзі маюць шэраг абмежаванняў, між іншым не могуць заключаць шлюб з законнанароджанымі яўрэямі, а толькі з мамзерамі ці празелітамі (людзьмі, якія прынялі іўдаізм). У 1966 г. Ханах вырашыў ажаніцца з законнанароджанай дзяўчынай і не атрымаў на гэта дазволу.

Аб гэтай сітуацыі даведался прэса, пачаліся публічныя абмеркаванні і новыя судовыя разбіральніцтвы. Унтэрман ў адным з інтэрв'ю заявіў, што не бачыць асаблівай праблемы і Ханах можа ажаніцца з іншай дзяўчынай, пры гэтым не парушаючы закон. Гэта выклікала абурэнне грамадскасці і абвінавачванне ў скрайным кансерватызме. Пасля некалькіх судовых паседжанняў на розных узроўнях, 19 лістапада 1972 г. спецыяльная калегія равінаў пад кіраўніцтвам новага галоўнага ашкеназскага равіна Шлома Горэна абвесціла, што Ханах і Мір'ям Лангеры з'яўляюцца законнанароджанымі і ў той жа дзень адбыліся дзве шлюбныя цырымоніі. У кансерватыўных і артадаксальных колах гэтае рашэнне і шлюбы выклікалі абурэнне і спарадзілі новую хвалю дыскусій, якія працягваліся яшчэ некаторы час. Равін Унтэрман працягваў адстойваць сваю пазіцыю па гэтым пытанні. На жыццё Лангераў аднак гэта ўжо не ўплывала і ніхто больш не спрабаваў іх абвесціць мамзерамі [13].

У сваёй практыцы Унтэрман прытрымліваўся палягчаючых і памяркоўных прынцыпаў па шматлікіх пытаннях Галахі, падтрымліваў Дзяржаву Ізраіль і яе інстытуцыі. Сярод яго важных пастаноў адна асабліва тычылася правоў жанчын: ён дазволіў паціснуць руку жанчыне, калі яна яе працягнула першай, не ведае законаў і можа палічыць адмову падаваць ёй руку асабістай абразай. Аднак нягледзячы на дастаткова ліберальны падыход да Галахі ён быў супраць мабілізацыі жанчынаў у Армію абароны Ізраіля. У літаратуры адзначаецца таксама і тое, што многія рэспонсы равіна Унтэрмана вельмі дакладныя і зразумелыя нават без спецыяльных каментароў і цытуюцца іншымі рэлігійнымі аўтарамі [7]. Пасля адстаўкі з пасады галоўнага равіна Унтэрман адыйшоў ад публічнай дзейнасці, але працягваў выкладаць у навучальных установах.

Равін Ісэр Егуда Унтэрман памёр 26 студзеня 1976 г. на 90 годзе жыцця. Ён належаў да групы равінаў "старой школы" і карыстаўся ўсеагульнай павагай. Пахавальная цырымонія прайшла на Елеонскай гары ў Ерусаліме. У равіна Унтэрмана было 6 сыноў і дачка Эстэр. Адзін з яго сыноў, равін Морыс Унтэрман (1917-2000) служыў у сінагозе "Мармуровая арка" ў Лондане, а таксама ў іншых сінагогах Вялікабрытаніі [9].

Новыя сацыяльныя і палітычныя ўмовы былі выклікам для іўдаізму ў другой палове XX ст. Равін Унтэрман быў адным з тых, хто захоўваў асноўныя рэлігійныя прынцыпы, але намагаўся іх адаптаваць да новай сітуацыі. Асабліва важнымі яго дасягненнямі былі рэформа равінскіх судоў, пастановы, якія тычыліся шлюбу, правоў жанчынаў і асоб, якія прынялі іўдаізм.

**Літаратура:**

1. Isser Yehuda Unterman // The Department of Jewish Zionist Education [Электронны рэсурс] / Рэжым доступу : http://www.eilatgordinlevitan.com/vishnevo/v_pages/vstories_rabbi_unterman.html – Дата доступу : 16.05.2023.

2. Баціс, М. Гародня: сляды яўрэйскага жыцця. Праваднік па яўрэйскай Гародні / М. Баціс, У. Буцько, Н. Крапівіна, А. Паняеў, В. Сабалеўская, Ю. Фядосава, Э. Ханф, Г. Шлёгель // ARCHE-Пачатак. – 2010. - № 6. – С. 344–415.

3. Соболевская, О. Евреи Гродненщины: жизнь до Катастрофы / О. Соболевская, В. Гончаров. – Донецк: Норд-Пресс, 2005. – 375 с.

4. Чарнякевіч, А. М. Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919-1939 гг. / А. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрінт, 2015. – 306 с.

5. Мизрахи // Электронная еврейская энциклопедия ОРТ [Электронны рэсурс] / Рэжым доступу: https://eleven.co.il/zionism/parties-institutions/12759/ - Дата доступу: 22.05.2023.

6. Керен-ха-Иесод // Электронная еврейская энциклопедия ОРТ [Электронны рэсурс] / Рэжым доступу: https://eleven.co.il/zionism/parties-institutions/12055/ - Дата доступу: 22.05.2023.

7. Unterman Isser Yehuda // Encyclopaedia Judaica [Электронны рэсурс] / Рэжым доступу: https://www.encyclopedia.com/religion/encyclopedias-almanacs-transcripts-and-maps/unterman-isser-yehuda - Дата доступу: 16.05.2023.

8. Объединённый еврейский призыв // Электронная еврейская энциклопедия ОРТ [Электронны рэсурс] / Рэжым доступу: https://eleven.co.il/diaspora/public-organizations/13040/ - Дата доступу: 22.05.2023.

9. Rabbi Isser Yehuda Unterman, Former Ashkenazic Chief Rabbi Dead at 90 // JTA Daily News Bulletin. – 1976. – January 27. – P. 3.

10. Унтерман Исер Иехуда // Электронная еврейская энциклопедия ОРТ [Электронны рэсурс] / Рэжым доступу: https://eleven.co.il/state-of-israel/social-religious-life/14219/ - Дата доступу:16.05.2023.

11. Zakheim, Dov S. Transforming Israel’s Chief Rabbinate / D. S. Zakheim [Электронны рэсурс] / Рэжым доступу: https://www.jewishideas.org/article/transforming-israels-chief-rabbinate - Дата доступу: 16.05.2023.

12. Rosenbaum, A. Conversion in Israel: The Russian Aliya / A. Rosenbaum // The Jerusalem Post. – 2017. – November 1[Электронны рэсурс] / Рэжым доступу: https://www.jpost.com/Magazine/Conversion-in-Israel-The-Russian-Aliya-512079 - Дата доступу: 16.05.2023.

13. Элькин Александр. Дело Лангеров // Лехаим. – 2012. - № 3 (адар 5772 г.) [Электронны рэсурс] / Рэжым доступу: https://lechaim.ru/ARHIV/239/elkin.htm?ysclid=lhyp1spmtz130722347 - Дата доступу: 16.05.2023.

***Аннотация.*** Статья посвящена уроженцу Бреста, раввину Исеру Иегуде Унтерману (1886-1976). В 1946 – 1964 гг. он был главным ашкеназским раввином Тель-Авива, а в 1964 – 1972 гг. – главным ашкеназским раввином Израиля. Его деятельность оказала значительное влияние на современный иудаизм.

***Ключевые слова*:** иудаизм, Галаха, Беларусь, Великобритания, Израиль.

RABBI ISSER YEHUDA UNTERMAN AND THE SIGNIFICANCE
OF HIS WORK FOR MODERN JUDAISM

*Annotation*. The article is dedicated to a native of Brest, Rabbi Isser Yehuda Unterman (1886-1976). In 1946-1964 he served as Ashkenazi Chief Rabbi of Tel Aviv, and in 1964-1972 he was the Ashkenazi Chief Rabbi of Israel. His work has had a significant impact on modern Judaism.

*Key words*: Judaism, Halakha, Belarus, Great Britain, Israel.

**Сведения об авторе:**

**Ціхаміраў Андрэй Уладзіміравіч**, магістр культуралогіі, УК "Гродзенскі дзяржаўны музей гісторыі рэлігіі", загадчык аддзела навукова-даследчай і экспазіцыйна-выставачнай работы, г. Гродна, Беларусь.

Тихомиров Андрей Владимирович, магистр культурологии, УК «Гродненский государственный музей истории религии», заведующий отделом научно-исследовательской и экспозиционно-выставочной работы, г. Гродно, Беларусь.

Andrei Tsikhamirau, M.A. in Cultural Studies, Hrodna State Museum of the History of Religion, Head of the Department of Research and Exhibition Work, Hrodna, Belarus.

УДК 316.42/316.33

# ТЕНДЕНЦИИ ДИНАМИКИ ЧИСЛЕННОСТИ ИССЛЕДОВАТЕЛЕЙ В РЕГИОНАХ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ С 2015 ПО 2021 ГГ.

*И. Н. ШАРЫЙ*
*Институт социологии Национальной академии наук Беларуси*
*г. Минск, Беларусь*

Изучение региональных особенностей динамики численности исследователей в Республике Беларусь имеет существенное значение в двух основных аспектах: исследователи в регионах являются составляющей кадрового потенциала науки страны, в то же время они представляют кадровый потенциал научно-технической сферы региона, влияющей на перспективы развития региональной экономики. Развитие сферы научных исследований и разработок, инновационной деятельности в регионах является одним из приоритетов регионального развития в Республике Беларусь. В то же время региональные особенности развития кадрового потенциала науки остаются недостаточно изученными, недостаточное внимание уделено сравнительному анализу новых тенденций динамики численности исследователей в региональном разрезе. В таблице 1 представлены данные, характеризующие особенности динамики численности исследователей в регионах Республики Беларусь с 2015 по 2021 гг. Поскольку с 2019 по 2021 гг. численность исследователей существенно изменилась, представлены данные с учетом этих изменений.